# АФЕРТА
## на заключэнне дагавору па афармленні банкаўскіх плацежных картак з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання ААТ «ААБ Беларусбанк»

Гэты дакумент, размешчаны Адкрытым акцыянерным таварыствам «Ашчадны банк «Беларусбанк», названым у далейшым «БАНК», у сетцы Інтэрнэт на вэб-сайце па адрасе www.belarusbank.by, сістэмах М-банкінг, Інтэрнэт-банкінг, а таксама ў інфакіёсках БАНКА, з’яўляецца публічнай афертай, гэта значыць прапановай БАНКА заключыць дагавор па афармленні банкаўскай плацежнай карткі (далей – картка) з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання ААТ «ААБ Беларусбанк» з фізічнай асобай – рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, назвай у далейшым «КЛІЕНТ», якая адгукнецца на гэту прапанову (акцэптуе публічную аферту) у парадку, устаноўленым гэтай афертай.

Акцэптам аферты, гэта значыць згодай КЛІЕНТА заключыць Дагавор па афармленні банкаўскай плацежнай карткі з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання ААТ «ААБ Беларусбанк» (далей – Дагавор) з’яўляецца факт аплаты КЛІЕНТАМ узнагароджання за абслугоўванне карткі ў парадку, прадугледжаным гэтым Дагаворам.

З моманту акцэпту гэтай аферты БАНК лічыць сябе заключыўшым Дагавор з КЛІЕНТАМ, які здзейсніў гэты акцэпт. Гэты Дагавор лічыцца заключаным паміж КЛІЕНТАМ і БАНКАМ, названымі ў далейшым «БАКІ», у пісьмовай форме з дня аплаты КЛІЕНТАМ узнагароджання за абслугоўванне карткі (акцэпт аферты).

## 1. ПРАДМЕТ ДАГАВОРУ

Прадметам гэтага Дагавору з’яўляецца аказанне БАНКАМ КЛІЕНТУ паслуг па афармленні карткі, заказанай з дапамогай сістэм М-банкінг, Інтэрнэт-банкінг, вэб-сайта па адрасе www.belarusbank.by (далей – вэб-сайт) і інфакіёскаў БАНКА, а таксама праз Кантакт-цэнтр БАНКА (далей – сістэмы дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання БАНКА) пасля аплаты КЛІЕНТАМ БАНКУ ўзнагароджання за абслугоўванне карткі ў памеры, устаноўленым Зборнікам узнагароджанняў за аперацыі, выконваемыя БАНКАМ, а таксама на ўмовах Комплекснай праграмы лаяльнасці БАНКА.

## 2. ПАРАДАК АФАРМЛЕННЯ КАРТКІ І АПЛАТЫ ЎЗНАГАРОДЖАННЯ ЗА ЯЕ АБСЛУГОЎВАННЕ

2.1. Афармленне карткі, заказанай КЛІЕНТАМ з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання БАНКА, ажыццяўляецца БАНКАМ на падставе запоўненай КЛІЕНТАМ у электронным выглядзе заяўкі (у выпадку афармлення карткі праз Кантакт-цэнтр БАНКА – на падставе інфармацыі, атрыманай ад КЛІЕНТА з дапамогай тэлефоннага званка на нумар тэлефона 147) (далей – заяўка на картку) пасля аплаты КЛІЕНТАМ узнагароджання за абслугоўванне карткі.

2.2. Аплата КЛІЕНТАМ узнагароджання за абслугоўванне карткі ажыццяўляецца ў беларускіх рублях ў тэрміны, устаноўленыя БАНКАМ:

у выпадку заказу карткі з дапамогай вэб-сайта БАНКА – непасрэдна на вэб-сайце БАНКА (з прымяненнем тэхналогіі 3D-Secure або Інтэрнэт Пароля БЕЛКАРТ), з дапамогай АІС «Разлік» з выкарыстаннем карткі іншых банкаў у каналах іншых банкаў (па нумары заяўкі на картку, сфарміраваным пры яе афармленні, і ідэнтыфікацыйным нумары, пазначаным у заяўцы пры заказе карткі), у сістэме Інтэрнэт-банкінг або ў інфакіёсках БАНКА (па нумары заяўкі на картку, сфарміраваным пры яе афармленні, і нумары мабільнага тэлефона, пазначаным у заяўцы пры заказе карткі);

у выпадку заказу карткі праз Кантакт-цэнтр БАНКА – у інфакіёсках БАНКА (па нумары заяўкі на картку, прадастаўленым КЛІЕНТУ аператарам Кантакт-цэнтра БАНКА, або накіраваным на адрас электроннай пошты КЛІЕНТА), і нумары мабільнага тэлефона, пазначаным у заяўцы пры заказе карткі;

у выпадку заказу карткі з дапамогай сістэм М-банкінг, Інтэрнэт-банкінг, інфакіёска БАНКА – непасрэдна ў сістэмах М-банкінг, Інтэрнэт-банкінг, інфакіёску БАНКА адпаведна;

у выпадку заказу карткі ў рамках Комплекснай праграмы лаяльнасці БАНКА з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання БАНКА – непасрэдна ў сістэмах дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання.

2.3. Дакументам, які пацвярджае факт аплаты КЛІЕНТАМ узнагароджання за абслугоўванне карткі, з'яўляецца карт-чэк, фарміруемы на папяровым носьбіце і (або) у электронным выглядзе.

2.4.[1] Выдача карткі ажыццяўляецца пасля заключэння паміж БАНКАМ і КЛІЕНТАМ дагавору бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку, доступ да якога можа быць забяспечаны пры выкарыстанні карткі.

## 3. ПРАВЫ, АБАВЯЗКІ І АДКАЗНАСЦЬ БАКОЎ

3.1. БАНК абавязаны:

вырабіць картку на падставе запоўненай КЛІЕНТАМ заяўкі на картку (інфармацыі, прадастаўленай КЛІЕНТАМ аператару Кантакт-цэнтра) у адпаведнасці з умовамі гэтага Дагавору пасля аплаты КЛІЕНТАМ узнагароджання за яе абслугоўванне;

забяспечыць канфідэнцыяльнасць любой інфармацыі, атрыманай ад КЛІЕНТА ў рамках выканання гэтага Дагавору.

3.2. КЛІЕНТ абавязаны:

3.2.1. пазначыць (прадставіць) поўную і дакладную інфармацыю пры афармленні заяўкі на картку з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання БАНКА;

---

[1] Гэты пункт прымяняецца ў выпадку адсутнасці заключанага дагавору бягучага (разліковага) банкаўскага рахунку, доступ да якога можа быць забяспечаны пры выкарыстанні карткі.

3.2.2. атрымаць афармленую ў адпаведнасці з гэтым Дагаворам картку на працягу 6 месяцаў з дня аплаты ўзнагароджання за абслугоўванне карткі.

3.3. Да ажыццяўлення аплаты ўзнагароджання за абслугоўванне карткі КЛІЕНТ абавязаны праверыць паўнату і правільнасць інфармацыі, унесенай ім пры афамленнні заяўкі на картку, а пры заказе карткі праз Кантакт-цэнтр БАНКА – правільнасць даных, унесеных аператарам Кантакт-цэнтра ў адпаведную заяўку (пазначаныя даныя даступны ў інфакіёску БАНКА па нумары заяўкі на картку, прадастаўленым КЛІЕНТУ аператарам Кантакт-цэнтра, або накіраваным на адрас электроннай пошты КЛІЕНТА).

Праводзячы аплату ўзнагароджання за абслугоўванне карткі, КЛІЕНТ пацвярджае паўнату і правільнасць інфармацыі, якая ўтрымліваецца ў заяўцы на картку (правільнасць даных, унесеных аператарам Кантакт-цэнтра ў адпаведную заяўку).

3.4. БАНК мае права:

3.4.1. у аднабаковым парадку ўносіць змяненні ў гэты Дагавор. Інфармацыя аб унясенні змяненняў у гэты Дагавор размяшчаецца на вэб-сайце БАНКА не менш чым за 30 (Трыццаць) каляндарных дзён да ўступлення гэтых змяненняў у сілу;

3.4.2. у аднабаковым пазасудовым парадку адмовіцца ад выканання гэтага Дагавору ў выпадку прадастаўлення КЛІЕНТАМ няпоўнай або недакладнай інфармацыі пры афармленні заяўкі на картку;

3.4.3. знішчыць афармленую ў адпаведнасці з гэтым Дагаворам картку, не атрыманую КЛІЕНТАМ на працягу 6 месяцаў з дня аплаты ўзнагароджання за абслугоўванне карткі. Пры гэтым гэты Дагавор спыняецца, а выплачанае КЛІЕНТАМ узнагароджанне за абслугоўванне карткі вяртанню не падлягае.

3.5. За невыкананне або неналежнае выкананне абавязацельстваў па гэтым Дагаворы БАКІ нясуць адказнасць, прадугледжаную заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

3.6. БАНК не нясе адказнасць:

за прамую або ўскосную шкоду, якая ўзнікла ў КЛІЕНТА з прычыны няпоўнага, недакладнага (некарэктнага) пазначэння інфармацыі ў заяўцы на картку;

за неаказанне паслугі ў рамках гэтага Дагавору па акалічнасцях, якія не залежаць ад БАНКА (збой сувязі, адключэнне электраэнергіі, замена абсталявання, праграмнага забеспячэння або правядзенне работ, выкліканых неабходнасцю падтрымання працаздольнасці і мадэрнізацыі праграмнага і (або) апаратнага забеспячэння і да т.п.).

3.7. КЛІЕНТ нясе адказнасць за паўнату і дакладнасць інфармацыі, пазначанай у заяўцы на картку (у тым ліку, у выпадку прадстаўлення гэтай інфармацыі аператару Кантакт-цэнтра).

3.8. У выпадку невыканання КЛІЕНТАМ абавязацельстваў, прадугледжаных пунктамі 3.2.1, 3.3 гэтага Дагавору, якія прывялі да немагчымасці яго выканання і (або) адмовы БАНКА ад выканання Дагавору ў адпаведнасці з падпунктам 3.4.2 гэтага Дагавору, а таксама ў выпадку адмовы

КЛІЕНТА ад атрымання карткі, выплачанае ўзнагароджанне за абслугоўванне карткі вяртанню КЛІЕНТУ не падлягае.

## 4. ПАРАДАК ВЫРАШЭННЯ СПРЭЧАК, ІНШЫЯ ПАЛАЖЭННІ

4.1. Да адносін БАКОЎ па гэтым Дагаворы або ў сувязі з ім прымяняецца права Рэспублікі Беларусь.

4.2. Усе спрэчкі па гэтым Дагаворы або ў сувязі з ім разглядаюцца судом па месцы знаходжання БАНКА.

## 5. РЭКВІЗІТЫ БАНКА

Месца знаходжання: Рэспубліка Беларусь,
220089, г. Мінск, пр. Дзяржынскага, 18